# Х

## ХАДАНОВІЧ ІГАР



*Хадановіч Ігар Піліпавіч (10.6.1940, в. Шпількі Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.— 9.1.1966, Мінск; пахаваны на Усходніх могілках), празаік, паэт.*

Нарадзіўся ў сям'і настаўніка. У 1957—62 вучыўся на аддзяленні журналістыкі філфака БДУ. Скончыўшы універсітэт, працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». З 1963 у Мінскім абкоме камсамола. У 1964—66 у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Трагічна загінуў ад рукі бандыта.

Першы верш І. Хадановіча («Хлеб») надрукаваны ў 1957 на старонках газеты «Чырвоная змена». Першы зборнік яго апавяданняў, нарысаў і нататак «За акном дождж» выйшаў толькі пасля смерці, у 1967. Галоўны герой гэтай кнігі — чысты, даверлівы хлапчук, які яшчэ зусім не падрыхтаваны да барацьбы з несправядлівасцю і пошласцю, але ўжо напружана раздумвае пра сваё месца ў жыцці. Творы І. Хадановіча вызначаюцца высокім маральным пафасам, тонкімі назіраннямі, вялікай цікавасцю да ўнутранага свету чалавека, імкненнем да псіхалагічнага абгрунтавання кожнага ўчынку героя. *Т. М. Тарасава.*

## Бібліяграфія


1.2.

За акном дождж: Апавяданні. Мн., 1967. Рэц.: Бечык В. На пачатку дарогі // Полымя. 1967. № 10; Бураўкін Г. След на зямлі // ЛіМ. 1967. 25 ліп.; Мехаў У. Акно ў сэрца // Маладосць. 1967. № 6; Паўлаў У. Пырскі сонца // Чырв. змена. 1967. 25 ліп.

На досвітку: Апавяданні, нарысы, з запісных кніжак і пісьмаў. Мн., 1986.

1.3.

**1957.** Хлеб: [Верш] // Чырв. змена. 29 снеж.

**1958.** Эстафета бацькоў: [Верш] // Чырв. змена. 6 ліст.

**1959.** Радзіма мая: [Верш] // Калг. праўда. 1 студз.

**1960.** Новы дом: Апавяданне // Звязда. 6 ліст.

**1961.** За вокнамі дождж: Апавяданне // ЛіМ. 1 жн.; Свежы вецер: (Расказы аб важатых з вытворчасці) // Чырв. змена. 4 студз.; На граніцы — ЮСП // Там жа. 3 жн.

**1963.** Раннія яблыкі: Апавяданне // Маладосць. № 1.

**1965.** Пятая хата: Апавяданне // Беларусь. № 10; У кватэры заставаўся хлопчык: Апавяданне // Маладосць. № 9; На досвітку: Апавяданне // ЛіМ. 16 лют.; Цяжкае заданне: Апавяданне // Чырв. змена. 23 вер.

1.5.

На рускую мову. В квартире оставался мальчик: [Апавяданне] / Пер. Т. Мартыненко // Неман. 1968. № 1; Пятая хата: Рассказ // Волга. 1972. № 9.

2.3.

На беларускай мове. Бечык В. «Душа не сціхае...» // Бечык В. Свет жывы і блізкі. Мн., 1974; Брыль Я. Непарадны агляд // Брыль Я. Трохі пра вечнае. Мн., 1978. С. 17; Вярцінскі А. Высокае неба ідэала. Мн., 1979. С. 90—94: Яго ж. Чалавек з нашай біяграфіі // Хадановіч І. За акном дождж. Мн., 1967; Лісіцкі А. Талент чалавечнасці // ЛіМ. 1974.